Тэма стандартызацыі не новая для чытачоў «Звязды». Раней газета знаёміла з вопытам рэгіянальных цэнтраў стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі ў Слуцку, Магілёве, Гомелі, Бабруйску, Лідзе, Барысаве... Але досвед, які апынуўся ў цэнтры ўвагі цяпер, без нацяжкі можна назваць унікальным. У дзейнасці Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС) занадта многае падыходзіць пад азначэнне «ўпершыню ў практыцы». Невыпадкова ён лічыцца адным з найбольш кампетэнтных інстытутаў у галіне тэхнічнага рэгулявання ў СНД і на працягу многіх гадоў займаецца экспартам ідэй і распрацовак у гэтай сферы.

У гутарцы з карэспандэнтамі «Звязды» прынялі ўдзел дырэктар інстытута кандыдат тэхнічных навук Ірына АСМОЛА, яе намеснікі Аляксандр СКУРАТАЎ і Аляксандр ПАГОДЗІН.

БелДІСС:

САДЗЕЙНІЧАЕМ ПАВЫШЭННЮ ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ

Ірына АСМОЛА, дырэктар БелДІСС.

Дырэктар БелДІСС Ірына АСМОЛА:

— Сёння — Дзень стандартызацыі. Я хачу пажадаць, каб у нашым калектыве і надалей была невычарпальная колькасць ідэй, якія скіраваны на падтрымку дзяржаўнай палітыкі ў галіне тэхнічнага рэгулявання і павышэння якасці, на падтрымку тых функцый, якія выконвае Дзяржстандарт, каб мы змаглі паспяхова рэалізаваць усе задуманыя праекты.

З прафесійным святам вітаю таксама супрацоўнікаў Дзяржстандарта, рэгіянальных цэнтраў стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі, усіх калег, якія ўносяць свой уклад у развіццё такой патрэбнай для эканомікі і грамадства дзейнасці. Поспехаў у справах, здароўя, міру і дабрабыту!



Аснова безбар'ернага гандлю

— Можам смела сказаць, што мы — галаўная арганізацыя Дзяржстандарта па напрамку, які называецца «Дзяржаўная палітыка ў галіне тэхнічнага рэгулявання», — пачала размову **Ірына Асмола**. — Сферу нашай дзейнасці можна падзяліць на два складнікі. Ёсць вобласці, якія з'яўляюцца абсалютна ўнікальнымі — усяго такіх кірункаў каля 15, і мы ажыццяўляем гэтыя функцыі па даручэнні Дзяржстандарта і пад яго кіраўніцтвам. А ёсць віды дзейнасці, якія выконваем не мы адны, але тым не менш пазіцыянуем сябе лідарамі.

Значную частку нашай работы можна назваць бізнес-напрамкамі, якія пры тым, што вельмі патрэбны краіне, дазваляюць нам развівацца і рухацца далей.

У рамках дзяржаўнай палітыкі, якая ажыццяўляецца ў краіне, галоўная наша функцыя заключаецца ў тым, што мы як нацыянальны інстытут стандартызацыі ўдзельнічаем у распрацоўцы заканадаўчай базы, абавязковых тэхнічных патрабаванняў да прадукцыі і працэсаў, якія павінны будуць выконвацца не толькі ў нашай краіне, але і ў межах Мытнага саюза. Ажыццяўляем разгляд праектаў усіх тэхнічных рэгламентаў, даём свае заўвагі, праводзім экспертную ацэнку, удзельнічаем у рабоце камісій, дзе вядуцца дастаткова гарачыя дэбаты наконт таго, што павінна змяшчацца ў тэхнічных рэгламентах і ў якім выглядзе.

Аляксандр СКУРАТАЎ, намеснік дырэктара па тэхнічным рэгуляванні, стандартызацыі і інфарматызацыі.

Інстытут з'яўляецца непасрэдным распрацоўшчыкам шэрагу тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза — напрыклад, на нізкавольтнае абсталяванне, электрамагнітную сумяшчальнасць тэхнічных сродкаў, маркіроўку харчовай прадукцыі, цацкі, сельска- і лесагаспадарчыя трактары і прычэпы да іх. Сёння распрацоўваем тэхнічны рэгламент аб абмежаванні прымянення шкодных рэчываў у электратэхнічных і радыёэлектронных вырабах. Усяго ў рамках Мытнага саюза сёння прыняты 34 тэхнічныя рэгламенты. Прычым 5 з 7 распрацаваных Рэспублікай Беларусь — гэта распрацоўкі БелДІСС. Такім чынам, мы непасрэдна ўплываем на тое, каб у краіне і ў Мытным саюзе выпускалася бяспечная прадукцыя, былі належныя ўмовы яе вытворчасці і абаронены здароўе і жыццё грамадзян, а таксама навакольнае асяроддзе.

Інстытут — «рукі» Дзяржстандарта ў частцы аналізу ўкаранення патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў у Рэспубліцы Беларусь. Гэта важны складнік нашай дзейнасці, вельмі актуальны для краіны ва ўмовах інтэнсіўнага развіцця еўразійскай інтэграцыі.

Для выканання тэхнічных рэгламентаў, а таксама для павышэння якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі, што выпускаецца, ва ўсім свеце выкарыстоўваюць такі інструмент, як стандартызацыя. Дакументы, якія прапануюць і вытворцам, і спажыўцам лепшую практыку з пункту гледжання паказчыкаў прадукцыі ці паслуг, — гэта і ёсць стандарты. І мы сёння з'яўляемся актыўнымі ўдзельнікамі працэсу іх распрацоўкі. Акрамя гэтага, праз нас праходзяць усе стандарты, якія распрацоўваюцца ў нашай краіне, мы праводзім іх навукова-тэхнічную экспертызу. Інстытут — апошняя інстанцыя перад тым, як Дзяржстандарт прымае рашэнне аб зацвярджэнні і ўвядзенні іх у дзеянне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Трэба сказаць, што пасля стварэння Мытнага саюза ў нас адчувальна дабавілася работы. Напрыклад, калі да гэтага трэба было арганізаваць разгляд і разгледзець за год недзе 100 міждзяржаўных стандартаў (ДАСТ), якія распрацоўваліся для краін СНД, то цяпер гэтая лічба набліжаецца да 2000.

Слова бярэ Аляксандр Скуратаў, (у інстытуце ён адказвае за працэсы тэхнічнага нармавання, стандартызацыі і інфарматызацыі):

— Справа ў тым, што ў Мытным саюзе прыярытэтным з'яўляецца прымяненне ДАСТ. Іменна праз іх забяспечваецца выкананне патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза. У сучасных умовах, гэтак жа як і пасля распаду СССР у пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, выкарыстанне ДАСТ дазваляе захаваць магчымасць безбар'ернага гандлю на постсавецкай прасторы. А для нашай краіны — гэта найважнейшы рынак збыту прадукцыі.

На сённяшні дзень дзейнічае каля 20 тысяч такіх стандартаў. Частка дакументаў з таго часу змянілася, але іншыя дзейнічаюць. Работа па актуалізацыі гэтага фонду дастаткова сістэмна ажыццяўляецца краінамі — удзельніцамі СНД.

— Наколькі можна зразумець, распрацоўка стандартаў — справа «мнагаслойная», скажам так. Але ж і напрамкі стандартызацыі вельмі разнастайныя...

— Так, сапраўды, і адзінае, чым мы не займаемся — пытаннямі стандартызацыі ў галіне будаўніцтва, бо там існуе ўласная галіновая арганізацыя.

Сёння мы распрацоўваем стандарты ў харчовай галіне, у машынабудаванні, электратэхніцы, энергазбераж энні, сферы паслуг, інфармацыйных тэхналогіях і гэтак далей. Нават удзельнічаем у праектах, звязаных з распрацоўкай дзяржаўных стандартаў для касмічнай галіны і для атамнай энергетыкі. Сфера нашых інтарэсаў, як бачыце, надзвычай разнастайная.

Спецыфіка інстытута заключаецца яшчэ ў тым, што ў нас ёсць метадалагічныя падраздзяленні, задача якіх — вызначаць, як і куды, у якім напрамку павінна рухацца наша дзейнасць. Для гэтага яны праводзяць аналіз усяго новага, што з'яўляецца ў свеце, таго, чым займаюцца нашы партнёры, вывучаюць еўрапейскі і міжнародны досвед і ўносяць у якасці прапаноў свае наватарскія праекты. Дзякуючы рабоце такіх навуковых падраздзяленняў мы можам паўнапраўна ўдзельнічаць не толькі ў працэсах удасканалення тэхнічнай палітыкі ўнутры нашай краіны, але і ў рамках Мытнага саюза і СНД.

— Нішто так не пераконвае, як добры прыклад...

— Тут можна назваць шэраг новых стандартаў, якія пачалі дзейнічаць у 2014 годзе. Скажам, па бяспецы землярыйных машын мы выпусцілі серыю міждзяржаўных стандартаў на падставе еўрапейскіх нормаў. Яны закрылі ўсе патрабаванні ў гэтай галіне як да вытворцаў, так і да спажыўцоў. Размова ідзе пра пагрузчыкі, машыны гарызантальнага бурэння, бульдозеры, экскаватары, аўтагрэйдары, землявозы — усю наменклатуру такой тэхнікі.

Цікавая серыя міждзяржаўных стандартаў за гэты год з'явілася ў галіне хіміі і нафтахіміі. Мы таксама актыўна ўдзельнічаем у распрацоўцы метадалагічных стандартаў — як праводзіць выпрабаванні прадукцыі, яе сертыфікацыю і гэтак далей.

Актуальным кірункам з'яўляецца распрацоўка стандартаў у галіне вытворчасці так званай арганічнай прадукцыі — яна вырабляецца без прымянення пестыцыдаў, разнастайных хімікатаў, геннамадыфікаваных арганізмаў і вырашана на палях, якія правільна апрацоўваюць. Навукоўцы сцвярджаюць: гэта найбольш бяспечная для чалавека прадукцыя. Сёння гэты трэнд атрымаў дастаткова шырокае развіццё ў краінах Еўрасаюза, і лічыцца, што з цягам часу Беларусь можа стаць паўнапраўным удзельнікам працэсу пастаўкі такой прадукцыі на рынак Еўропы.

— З прыведзеных прыкладаў можна зрабіць выснову, што інстытут адсочвае адпаведнасць дзяржаўных стандартаў міжнароднаму ўзроўню...

— Так, мы імкнёмся, каб нашы стандарты былі гарманізаваны з міжнароднымі і еўрапейскімі. Такая палітыка вызначана і падтрымліваецца на дзяржаўным узроўні. Бо толькі ў гэтым выпадку для нашых вытворцаў будуць ствараццa найбольш спрыяльныя ўмовы для пастаўкі прадукцыі на знешнія рынкі. У нас ёсць арыгінальныя стандарты, унікальныя для нашай краіны, але большасць распрацоўваецца на падставе міжнародных і еўрапейскіх нормаў, што адпавядае агульнай палітыцы ў рамках пагаднення Сусветнай гандлёвай арганізацыі (СГА) па тэхнічных бар'ерах у гандлі.

— Цікава, якім жа чынам ажыццяўляецца сама распрацоўка стандарту?

— У сусветнай практыцы найбольш эфектыўнай формай для гэтага працэсу прызнаны тэхнічныя камітэты. Яны аб'ядноўваюць у сваім складзе экспертаў, якія распрацоўваюць стандарты з улікам інтарэсаў усіх зацікаўленых бакоў — дзяржавы, прамысловасці, бізнесу і спажыўцоў — і вызначаюць тэхнічную палітыку ў той ці іншай галіне.

Такія тэхнічныя камітэты дзейнічаюць на розных узроўнях: нацыянальным, рэгіянальным, міжнародным. Магчымасць удзельнічаць у іх працы ёсць сёння ў кожнай арганізацыі, але, трэба сказаць, карыстаюцца ёю далёка не ўсе, ад каго залежыць выкананне задачы па нарошчванні экспарту айчыннай прадукцыі, пашырэнні рынкаў яе збыту, павышэнні якасці і канкурэнтаздольнасці. Таму мы прыкладаем шмат намаганняў, каб актывізаваць удзел нашай прамысловасці, бізнесу, у першую чаргу, у працэсах нацыянальнай і міждзяржаўнай стандартызацыі. Больш за тое, сёння ўжо недастаткова абмяжоўвацца толькі рамкамі СНД, варта праводзіць уласную палітыку ў міжнародным згуртаванні.

На сучаснай інфармацыйнай платформе

— Наколькі мы разумеем, адной з асноўных задач Дзяржстандарта і яго арганізацый з'яўляецца інфармацыйнае забеспячэнне суб'ектаў гаспадарання, прадастаўленне ім доступу да існуючай тэхнічнай нарматыўнай прававой базы.

А. Скуратаў. З гэтай мэтай створаны Нацыянальны фонд тэхнічных нарматыўных прававых актаў (ТНПА), вядзенне якога ажыццяўляе БелДІСС. Сёння ў ім змешчана больш за 200 000 дакументаў, з іх больш за 26 000 датычацца патрабаванняў унутранага рынку.

Унікальныя прадукты ёсць у інстытута і ў гэтым напрамку. Нам удалося сфарміраваць унікальны рэсурс — поўнатэкставую базу даных усяго тэхнічнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі, якая ўключае як тэхнічныя рэгламенты Мытнага саюза, так і нацыянальныя стандарты трох краін. Гэтая сістэма даступная праз сетку інтэрнэт пры дапамозе парольнага доступу.

Гэты рэсурс — адзін з модуляў сістэмы комплекснага інфармацыйнага забеспячэння, накіраванай не толькі на прадастаўленне інфармацыі аб ТНПА, але і аўтаматызацыю працэсаў планавання і распрацоўкі стандартаў, іх выдання, а таксама фарміравання і вядзення фондаў дакументаў на прадпрыемствах. Напрыклад, на БелАЗе ці «Атланце» ТНПА ўключаюць у сябе тысячы адзінак, якія яны выкарыстоўваюць у працэсе вытворчасці. На фарміраванне і падтрыманне, актуалізацыю такіх фондаў трацяцца істотныя сродкі. Выкарыстанне нашай сістэмы (зазначу: з нашай пастаяннай дапамогай, нашым куратарствам) дазваляе прадпрыемствам істотна скараціць свае затраты.

Мы сёння маем каля 1000 карыстальнікаў гэтай сістэмы толькі на тэрыторыі рэспублікі. Значыць, прамысловасць прымае новую тэхналогію і імкнецца павышаць эфектыўнасць сваёй дзейнасці ў гэтым кірунку. А тым, хто пакуль больш ахвотна карыстаецца папяровымі носьбітамі інфармацыі, можа дапамагчы наш магазін «Стандарты», размешчаны ў інстытуце.

Асобна адзначу, што БелДІСС таксама вядзе базы даных міжнародных і рэгіянальных арганізацый па стандартызацыі, спецыялізаваных арганізацый розных краін, напрыклад, ключавых арганізацый у харчовай сферы, нафтахіміі і гэтак далей. Пры распрацоўцы стандартаў, новай прадукцыі, экспартных паставак мы абапіраемся на іх даследаванні, на іх вопыт і веды. Можам любому нашаму прадпрыемству набыць патрэбныя яму для работы міжнародныя стандарты. Гэта форма нашай дапамогі прадпрыемствам-экспарцёрам.

Тэхнічная прадукцыя — асноўны напрамак дзейнасці выпрабавальнага цэнтра.

І. Асмола. Сёння яшчэ ёсць прыклады, калі прадпрыемства несвоечасова звярнулася да нашага рэсурсу і сутыкнулася з праблемамі ў рэалізацыі. Прадукцыю спынілі на мяжы, бо змяніліся патрабаванні да яе. Таму, атрымаўшы пропуск на сусветныя рынкі, прадпрыемства павінна ўважліва адсочваць усе змены ў заканадаўстве замежных краін, якія тычацца яго прадукцыі, інакш лёгка стаць неканкурэнтаздольным ці проста страціць права доступу на той ці іншы рынак. З'явіліся змены ў патрабаваннях — арганізацыя павінна рэагаваць. Дзякуючы нашай сістэме прадпрыемствы амаль у рэжыме анлайн могуць бачыць, што змянілася, як змянілася і да чаго трэба імкнуцца.

Адпавядае ўсім патрабаванням

А. Пагодзін. Я хацеў бы крыху сказаць пра работу выпрабавальнага цэнтра, за дзейнасць якога адказваю.

Яго работнікі, напрыклад, выпрабоўваюць прадукцыю айчынных вытворцаў на стадыі распрацоўкі і пастаноўкі на паток. На жаль, бывае так, што дакументы, стандарты — як еўрапейскія, так і тыя, што прымаюцца ў рамках Мытнага саюза, айчынныя канструктары не чытаюць і не ведаюць. Гэта высвятляецца, калі прадукцыя паступае да нас на выпрабаванні. Мы дапамагаем яе «даводзіць» да ўзроўню, які патрабуецца, выправіць усе неадпаведнасці, а гэта заўсёды доўга, нават у рамках Мытнага саюза.

Што датычыць пастаўкі прадукцыі ў Еўрапейскі саюз, то наш інстытут удзельнічае ў экспартнай праграме беларускіх прадпрыемстваў з 2004 года. І пачалася яна з таго, што БелДІСС заключыў пагадненне з інстытутамі шэрагу краін Еўрасаюза аб прызнанні вынікаў нашых выпрабаванняў. Гэта дазваляе нашым вытворцам праходзіць неабходныя працэдуры непасрэдна ў нас і пры станоўчых выніках атрымліваць права наносіць на сваю прадукцыю СЕ-маркіроўку, якая сведчыць, што прадукцыя бяспечная. Без такой маркіроўкі мяжу на еўрапейскі рынак не перасячэш. За гэты час (з 2004 года) з нашай дапамогай права маркіраваць прадукцыю запаветнай абрэвіятурай атрымалі прыкладна паўтары тысячы мадэляў і мадыфікацый айчынных тавараў. Нам таксама даручана праз некаторы час пасля атрымання прадпрыемствам права маркіраваць прадукцыю знакам СЕ праводзіць інспекцыйны кантроль. Беларускія вытворцы пры гэтым таксама эканомяць валюту, бо раней такі кантроль праводзілі выключна замежныя інстытуты.

І. Асмола. Нават калі прадукцыя не ўваходзіць у сферу акрэдытацыі нашага цэнтра, мы праз еўрапейскіх калег дапамагаем знайсці лабараторыю, якая магла б правесці такія выпрабаванні і аформіць вынік. Інакш кажучы, каардынуем гэтую работу. Трэба мець на ўвазе, што асноўны кірунак дзейнасці выпрабавальнага цэнтра — чыста тэхнічная прадукцыя. Гэта прадукцыя машынабудавання, разнастайны інструмент, электраўстановачныя вырабы, медыцынская тэхніка — інакш кажучы, усё, што ўстаўляецца ў разетку.

Аляксандр ПАГОДЗІН, намеснік дырэктара па сертыфікацыі і выпрабаваннях.

А. Пагодзін. Праводзім выпрабаванні і ў рамках пацвярджэння адпаведнасці прадукцыі патрабаванням 7 тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза, якія датычацца нізкавольтнага абсталявання, электрамагнітнай сумяшчальнасці, машын, транспартных сродкаў, цацак, сродкаў індывідуальнай абароны, прадукцыі для дзяцей.

Акрамя выпрабавальнага цэнтра ёсць і орган па сертыфікацыі прадукцыі. Галіны акрэдытацыі ў іх працэнтаў на 80 супадаюць, і для кліента гэта зручна: усе працэдуры можна прайсці, што называецца, у адным месцы.

І. Асмола. Вось што яшчэ важна. У нас праходзяць выпрабаванні і працэдуры пацвярджэння сваёй бяспечнасці і тыя тавары, якія завозяцца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь — а цяпер гэта ўжо лічыцца і тэрыторыяй Мытнага саюза — з еўрапейскіх і іншых краін. Свайго роду бар'ер, каб не завозілася няякасная ці шкодная для здароўя прадукцыя.

А. Пагодзін. Так, галоўная мэта — абарона жыцця і здароўя чалавека. Сёлета было праведзена каля 2000 выпрабаванняў, з іх больш чым за сотню атрымалі адмоўны вынік, і тавар не быў прапушчаны на тэрыторыю Беларусі.

Адзначу таксама, што лабараторыі нашага выпрабавальнага цэнтра аснашчаны сучасным і ўнікальным абсталяваннем, якое дазваляе атрымліваць дакладныя і аб'ектыўныя вынікі. Такое абсталяванне не заўсёды ёсць у нашых калег.

І калі працягваць тэму ўнікальнасці, то ў інстытуце працуюць дзве даволі цікавыя лабараторыі. Першая — па выпрабаваннях касавых падсумавальных апаратаў, другая — па выпрабаваннях гульнявых апаратаў. Абедзьве праводзяць выпрабаванні і экспертызу гэтых вырабаў з мэтай уключэння ў адпаведныя дзяржаўныя рэестры, што дазваляюць іх выкарыстанне на тэрыторыі нашай краіны. Такім чынам, інстытут займаецца забеспячэннем іх вядзення — гэтую функцыю нам даверыў Дзяржстандарт.

І. Асмола. Сёння адна са стратэгічных і найскладанейшых задач, рэалізацыяй якой займаецца інстытут, гэта тое, што ў рамках міжнароднага праекта тэхнічнай дапамогі, пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза і ўрада нашай краіны, мы ствараем яшчэ адну ўнікальную лабараторыю — па вызначэнні энергаэфектыўнасці (перш за ўсё ашчаднасці) шырокай гамы бытавых электрапрыбораў і прамысловай прадукцыі. Лабараторыя стане цудоўнай стартавай пляцоўкай для нашых вытворцаў для пашырэння экспарту канкурэнтаздольнай і энергаэканомнай прадукцыі.

І яшчэ. Гаворачы пра тэму канкурэнтаздольнасці, нельга не сказаць пра яшчэ адзін важны кірунак нашай дзейнасці. Інстытут сёння самы вялікі і з шырокім спектрам паслуг орган па сертыфікацыі сістэм менеджменту. Па сутнасці, гэта сістэма кіравання прадпрыемствам, рознымі аспектамі яго жыццядзейнасці. Існуюць патрабаванні ў выглядзе стандартаў да сістэм менеджменту якасці, сістэм кіравання аховай працы, навакольным асяроддзем, менеджменту харчовай і інфармацыйнай бяспекі, энергаменеджменту. У аснове гэтых патрабаванняў — лепшыя дасягненні сусветнай вытворчай практыкі, абапіраецца на якія кожны працоўны калектыў проста павінен, каб дзейнічаць больш эфектыўна і быць канкурэнтаздольным у сучасных умовах.

Як сацыяльна арыентаваная дзяржава, Беларусь клапоціцца пра тое, каб грамадзянам аказваліся якасныя паслугі. Таму інстытут займаецца сертыфікацыяй і класіфікацыяй гасцініц, лагістычных паслуг. Праводзіцца таксама сертыфікацыя цэнтраў па тэхнічным абслугоўванні і рамонце бытавой радыёэлектроннай апаратуры, цырульняў і гэтак далей.

...Можна многа расказваць аб напрамках дзейнасці БелДІСС — аб працы інстытута па арганізацыйна-тэхнічным забеспячэнні дзяржаўных конкурсаў у галіне якасці (у тым ліку конкурсу на саісканне прэміі ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці), конкурсаў і алімпіяд сярод студэнтаў і маладых спецыялістаў. А таксама як выдаўцоў цэлага шэрагу спецыялізаваных выданняў, у тым ліку часопіса «Стандартизация». Тэматычныя падраздзяленні інстытута выпускаюць штогод цэлыя блокі метадычных дапаможнікаў і рэкамендацый, праводзяць семінары і канферэнцыі. Але гэта ўсё — тэма для наступнай сустрэчы і публікацыі.

Адзінае, пра што хацелася б сказаць у заключэнне і на што звярнуць увагу чытачоў: усе напрамкі дзейнасці, якія сёння ажыццяўляе калектыў БелДІСС пры падтрымцы Дзяржстандарта, аб'ядноўвае адзіная мэта — садзейнічанне павышэнню якасці. Якасці не толькі прадукцыі, тавараў ці паслуг, а наогул — якасці нашага з вамі жыцця. Згадзіцеся, гэта вельмі ганаровая і вельмі адказная справа.

Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

Ім ствараць будучыню інстытута.

У Нацыянальным фондзе ТНПА выкарыстоўваюцца як традыцыйныя формы работы, так і сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі.

Распрацоўка стандартаў — справа калектыўная.

БелДІСС — цэнтральнае дзяржаўнае навукова-практычнае прадпрыемства Дзяржстандарта ў галіне тэхнічнага нармавання і стандартызацыі, ацэнкі адпаведнасці і сістэм менеджменту.
Фіналіст 6-га Міжнароднага турніру па якасці краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (2010).
Пераможца конкурсу «Кампетэнтнасць-2013» у намінацыі «Найлепшая практыка ў галіне сістэм менеджменту».
Акрэдытаваны ў якасці навуковай арганізацыі.
Афіліраваны член у Еўрапейскай арганізацыі па якасці.
Сістэма менеджменту якасці сертыфікавана на адпаведнасць патрабаванням СТБ ISO 9001.
БелГИСС
БелДІСС
г. Мінск, вул. Мележа, д. 3
220113, Рэспубліка Беларусь
тэл. (017) 262 05 52
тэл./факс (017) 262 15 20
belgiss@mail.belpak.by
www.belgiss.by
УНП 100219737